ШАКАЛАДНЫ ПІНЖАК І БЛУЗА З ЖАБО

300 рублёў на гардэроб

У сталічным ЦУМе адзенне для школьнікаў пачалі прадаваць яшчэ з 10 ліпеня. Хлопчыкам прапануюць на выбар 70 мадэляў касцюмаў і 35 фасонаў кашуль. Для дзяўчат завезлі 75 відаў касцюмаў, 70 — сарафанаў, 60 — блуз. Чаравікаў і туфляў — каля 360 мадэляў. Здаецца, можна знайсці камплект на любы густ.

У аддзеле для хлопчыкаў Аляксандр Балашоў падбірае сыну Сашу касцюм. Тату на шопінгу бачыць нязвыкла.

— Ну а як, сына ж апранаем, — з усмешкай тлумачыць, як яго занесла ў краму, Аляксандр-старэйшы.

Саша ідзе ў дзявяты клас. Хлопцу, акрамя касцюма, патрэбны кашуля і спартыўная форма.

«У беларускіх вытворцаў апошнім часам суадносіны цаны і якасці набліжаюцца да жаданага. Купляць у краме цяпер не нашмат даражэй, чым на рынку».

Пінжак для Сашы Балашова знойдзены. У ім і на заняткі можна, і вершы на сцэне чытаць.

— У яго фігура нестандартная: сын высокі і стройны. Але сярод беларускага адзення заўсёды знаходзім падыходзячы варыянт, — гэта ўжо мама Наталля падаспела. — Форму купляем кожны год, не бяром на выраст, каб не вісела мяшком. Хочацца бачыць сына прыгожым. Тым больш узрост такі, дзяўчаты ўжо заглядваюцца.

Саша сціпла прапускае мамін камплімент міма вушэй і прымярае цёмна-сіні пінжак. Тое, што трэба.

— Ён яшчэ і артыст, таму пінжак заўсёды патрэбны. Саша чытае вершы, — расказвае мама.

Па падліках Наталлі, летась на адзенне для школы з сямейнага бюджэту пайшло недэнамінаваных 2,3 мільёна. Цяпер, заўважае жанчына, цэны выраслі неістотна, таму сума не павінна быць нашмат большай.

Шасцікласніца Ангеліна Мазіцкая, пакуль яе мама перабірае вешалкі, расказвае нам, у чым хацела б пайсці ў школу.

Фота Надзеі БУЖАН.

Для дзяўчат прапануюць 60 мадэляў блуз.

— У спадніцы пышнай, блузцы светла-ружовага колеру. Без рушаў. Мама бачыла такую, але не купіла, — уздыхае дзяўчына. — Штаны хачу клёшныя са стрэлкамі. І камізэльку звычайную: у нас у гімназіі камізэлька абавязковая.

Хоць строгая школьная форма Ангеліне не надта падабаецца: лепш бы дазвалялі хадзіць у чым заўгодна.

— Для мяне галоўнае, каб было практычна і зручна, — дзеліцца сваім бачаннем формы мама Ангеліны Вольга. — І, вядома, каб дачцэ самой падабалася, іншае мы і не разглядаем. Як асартымент? Ёсць выбар, пытанняў няма.

Гардэроб на мінулы навучальны год сям'і абышоўся прыкладна ў 250 рублёў. Сёлета, напэўна, 300-400 рублёў давядзецца аддаць, прыкідвае Вольга.

Ніякіх стразаў і рушаў

— Ты ж глядзіш «Модны прысуд», павінна ведаць, што стыльна, а што — не, — з усмешкай падбадзёрвае мужчына сваю жонку.

Гэта шукае адзенне для школы сям'я Курсавых. Арына, якая пойдзе ў восьмы клас, ужо прадумала свой вобраз да дробязяў:

— Хачу спадніцу-шатландку, звычайную строгую кашулю. І гальштук, каб вылучацца з натоўпу.

— А што ніколі б не апранула?

— Рэчы з банцікамі, рушамі, стразамі і стужачкамі.

Вытворцам, бадай, варта прыслухацца: не першае дзіця кажа, што не любіць адзенне з лішнімі ўпрыгажэннямі.

Мама Наталля Курсава тым часам выбірае камплект для малодшай дачкі. Сама Даша (у верасні малая пойдзе ў першы клас) да шопінгу раўнадушная: у кутку для дзяцей размалёўвае карцінкі з іншымі непаседамі.

— У мінулым годзе мы зайшлі і адразу апрануліся, а сёлета не шанцуе. То нашага памеру няма, то брак на рэчы, — дзеліцца праблемамі Наталля і нацягвае на Дашу адну з выбраных блуз: — Будзеш у люстэрка глядзецца?

— Не хачу. Давай хутчэй! — малая нецярпліва паглядае на пакінутую размалёўку.

— Табе падабаецца строгая форма? — пытаемся ў Дашы.

— Так!

— А хто нядаўна плакаў, што нязручна апранаць? — смяецца мама.

Наталля ўпэўнена: на заняткі дзеці павінны хадзіць у форме. «Каб усе роўныя былі, не вылучаліся. У сем'яў жа розны даход. Дый бацькам зручней: дзіця ведае, што гэта адзенне толькі для школы, таму дадому прыходзіць і адразу пераапранаецца».

У секцыі абутку разгаварыліся з Тацянай Дзяшко. У яе планах сёння — купіць туфлі і красоўкі для дзвюх дачок. Мама заўсёды стараецца пераносіць школьны шопінг бліжэй да навучальнага года, каб за лета дзяўчаты не выраслі з новых рэчаў.

Насця і Каця Дзяшко пакуль не вызначыліся, што з абутку ім больш падабаецца. Кажуць, усе туфлі прыгожыя. Для мамы ж, што хаваць, многае вырашае кошт. «У беларускіх вытворцаў апошнім часам суадносіны цаны і якасці набліжаюцца да жаданага. Купляць у краме цяпер не нашмат даражэй, чым на рынку».

Сёлетні прайс-ліст

Вывучаем цэннікі на школьную форму. Звычайны чорны касцюм для хлопчыкаў малодшага ўзросту каштуе ад 40 да 60 рублёў, для старшакласнікаў — 70-80 рублёў. Кашулю можна набыць за 30 рублёў. Для тых, хто хоча варыянт больш цікавы, айчынныя вытворцы прапануюць вельветавы пінжак шакаладнага колеру (падыдзе для ўрачыстых выпадкаў і пацягне на 74 рублі), стыльны пінжак у дробную сінюю клетку (каштуе 76 рублёў) і шэра-карычневы шарсцяны жакет (за 45 рублёў).

Блузы для дзяўчат — самых розных фасонаў. Звычайныя строгія, з жабо на каўняры, рукавамі ў ружачкі. Варыянт для вучаніцы малодшых класаў абыдзецца ў 25-40 рублёў. Прыкладна столькі ж каштуе сарафан.

Кашулі для старшакласніц прадаюць за 40 рублёў, штаны і спадніцы — за 20-40, жакеты — за 60. Прапануюць гатовыя трыкатажныя камплекты, касцюмы ў стылі «шанэль». За 60 рублёў можна набыць таксама прамую сукенку з накладнымі манжэтамі, чорнага колеру ці ў чырвона-ружовую клетку.

Спартыўны касцюм у сярэднім каштуе 50-70 рублёў. Красоўкі з тэкстылю ці штучнай скуры — 60-80 рублёў.

Цэннікі на туфлі і чаравікі для вучняў малодшага ўзросту — ад 40 да 60 рублёў. Абуць старшакласніка абыдзецца прыкладна на 20 рублёў даражэй.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.
lubneuskaya@zviazda.by

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Неспрыяльныя дні і гадзіны ў жніўні

2, аўторак, 2.00 – 4.30
4, чацвер, 6.30 – 9.30
6, субота, 5.30 – 19.00
8, панядзелак, 19.30 – 24.00
9, аўторак, 0.00 – 7.00
11, чацвер, 7.30 – 19.30
13, субота, 21.00 – 24.00
14, нядзеля, 0.00 – 6.00
16, аўторак, 4.30 – 14.00
18, чацвер, 11.30 – 18.30
20, субота, 14.30 – 22.30
22, панядзелак, 13.30 – 23.30
24, серада, 21.30 – 24.00
27, субота, 2.30 – 5.00
29, панядзелак, 8.30 – 10.00
31, серада, 6.30 – 17.30

■ Прававая гасцёўня

ЯК СКАСАВАЦЬ ШЛЮБ

без прысутнасці другой паловы

На пытанні адказвае начальнік упраўлення натарыята і загсаў Міністэрства юстыцыі Беларусі Жанна ЗАХАРАВА:

У які загс я магу падаць заяву, каб скасаваць шлюб?

Алена Г., *г. Пінск.*

— Заява падаецца ў аддзел загса па месцы рэгістрацыі па месцы жыхарства мужа і жонкі (ці аднаго з іх) на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, якое вызначаецца адзнакай аб рэгістрацыі па месцы жыхарства ў дакуменце (пасведчанні асобы). Адрасаваць заяву можна таксама ў аддзел загса па месцы рэгістрацыі па месцы знаходжання мужа і жонкі (або аднаго з іх) на тэрыторыі Беларусі, якое ўстаноўлена ў пасведчанні (даведцы) аб рэгістрацыі па месцы знаходжання. Скасаванне шлюбу праводзіцца на падставе сумеснай пісьмовай заявы абодвух аб рэгістрацыі скасавання шлюбу.

Мая жонка ў водпуску за мяжой, а праз тры дні ў нас рэгістрацыя скасавання шлюбу. Ці магу я прыйсці ў загс адзін?

Павел В., *г. Мінск.*

— Рэгістрацыя скасавання шлюбу здзяйсняецца ў прысутнасці абодвух (мужа і жонкі) па сканчэнні месяца з дня падачы сумеснай заявы. Калі хтосьці адзін не можа прыйсці, шлюб можна скасаваць без яго толькі пры наяўнасці пісьмовай заявы адсутнага. Пры гэтым сапраўднасць подпісу на заяве трэба засведчыць у натарыуса ці службовай асобы, якая ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі мае права здзяйсняць натарыяльныя дзеянні. За мяжой засведчыць подпіс могуць службовыя асобы дыпламатычных прадстаўніцтваў і консульскіх установаў Беларусі.

Пасля разводу (у 2012 годзе) я пакінула сабе прозвішча мужа. Зараз хачу вярнуць тое, што было ў мяне да рэгістрацыі шлюбу. Куды мне звярнуцца?

Галіна Пятроўна, *г. Смалявічы.*

— Каб вярнуць пасля разводу сваё дашлюбнае прозвішча, вы мусіце звярнуцца па рэгістрацыю змены прозвішча ў сувязі з жаданнем вярнуць дашлюбнае прозвішча, паколькі пра гэта не было заяўлена пры скасаванні шлюбу. Заява аб рэгістрацыі змены прозвішча, уласнага імя або імя па бацьку падаецца грамадзянамі Рэспублікі Беларусь, якім споўнілася 16 гадоў, у органы загса па месцы жыхарства.

Згодна з артыкулам 43 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб шлюбе і сям'і, муж ці жонка, якія пасля заключэння шлюбу змянілі сваё прозвішча на іншае, могуць карыстацца ім і пасля скасавання шлюбу. Пры жаданні змяніць прозвішча суд пры вынясенні рашэння аб скасаванні шлюбу або загс пры рэгістрацыі скасавання шлюбу прысвойвае асобе дашлюбнае прозвішча.

Мы развяліся з мужам у загсе два гады таму, і я пакінула сабе яго прозвішча. Як мне зараз пацвердзіць сваё дашлюбнае прозвішча?

А. Міранюк, *г. Мінск.*

— Заканадаўства прадугледжвае магчымасць атрымання даведкі, якая ўтрымлівае звесткі з запісу акта аб заключэнні шлюбу (пастанаўленне Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь ад 16 жніўня 2006 г. №43). Змест гэтага дакумента будзе сведчыць, што вы мянялі сваё прозвішча. Па даведку можна звярнуцца ў аддзел загса па месцы рэгістрацыі заключэння шлюбу або ў загс па месцы жыхарства. Пры выбары апошняга варыянта даведка будзе выпатрабавана ўстановай з аддзела загса па месцы захоўвання адпаведнага запісу акта. Пры гэтым трэба памятаць, што, згодна з заканадаўствам, немагчыма атрымаць паўторнае пасведчанне аб заключэнні шлюбу, які быў спынены або прызнаны несапраўдным.

Пасля разводу з мужам у мінулым годзе ў загсе згубіла пры пераездзе сваё пасведчанне аб скасаванні шлюбу. Як і дзе можна аднавіць гэты дакумент?

Ларыса Сяргееўна, *г.п. Вялікая Бераставіца.*

— Пры страце пасведчання аб рэгістрацыі акту грамадзянскага стану заканадаўствам прадугледжана магчымасць атрымаць яго паўторна. Выдача паўторных пасведчанняў рэгламентуецца артыкулам 202 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб шлюбе і сям'і.

Каб атрымаць паўторнае пасведчанне аб скасаванні шлюбу, трэба звярнуцца з пісьмовай заявай у аддзел загса па месцы рэгістрацыі скасавання шлюбу або ў архіў органаў загса па месцы захоўвання запісу акта аб скасаванні шлюбу. Таксама можна адрасаваць заяву ў загс па месцы свайго жыхарства — орган выпатрабуе з аддзела загса па месцы рэгістрацыі скасавання шлюбу пасведчанне, якое будзе ўручана заяўніку (вам). За выдачу паўторнага пасведчання прадугледжана дзяржаўная пошліна.

Шаноўныя чытачы, калі ў вас узніклі пытанні юрыдычнага характару, дасылайце іх на наш паштовы або электронны адрас sidarok@zviazda.by. У «Прававой гасцёўні» разам са спецыялістамі Мінюста мы будзем шукаць на іх адказы.